УДК 329.05

***Міхаіл Сяргеевіч Мамекін***
*аспірант 3-га года абучання ў форме суіскальніцтва каф. паліталогіі,*
*ст. выкладчык каф. паліталогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
***Mikhail Mamekin***
*3-d Year Graduate Student of the of the Form of Suicide of Department of Political Science,*
*Senior Lecturer of the Department of Political Science*
*of Belarusian State University*
e-mail: mafakoff23@mail.ru

# ІНСТЫТУЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

*Артыкул прысвечаны вызначэнню сутнасці працэсу інстытуцыяналізацыі. Разгледжаны агульныя заканамернасці інстытуцыяналізацыі палітычных партый, а таксама вызначаны асаблівасці субпрацэсаў інстытуцыяналізацыі палітычных партый, у прыватнасці прававой інстытуцыяналізацыі. Вызначаны асноўныя этапы палітычнай інстытуцыяналізацыі партый у Беларусі і вылучана асноўныя формы і напрамкі фарміравання «партыйнага» права ў Рэспубліцы Беларусь.*

***Ключавыя словы:*** *палітычны інстытут, палітычная партыя, інстытуцыналізацыя палітычных партый, канстытуцыяналзізацыя палітычных партый, формы і напрамкі прававой інстытуцыяналізацыі партый.*

## *Institutionalization of Political Parties in Republic of Belarus*

*The article is devoted to defining the essence of the process of institutionalization. Within the framework of the article, the general regularities of the institutionalization of political parties are considered, as well as the specifics of individual sub-processes of the institutionalization of political parties – in particular, legal institutionalization. The author identifies the main stages of the political institutionalization of parties in Belarus and highlights the main forms and directions of the formation of «party» law in the Republic of Belarus.*

***Key words:*** *political institute, political party, institutionalization of political parties, constitutionalization of political parties, forms and directions of legal institutionalization of parties.*

### Уводзіны

У сучасных умовах палітычнага жыцця Беларусі пытанне інстытуцыяналізацыі палітычных партый набывае асаблівую актуальнасць. Гэты працэс не толькі адлюстроўвае развіццё палітычнай сістэмы краіны, але і ўплывае на яе стабільнасць і дэмакратычнае развіццё. Улічваючы, што ў Беларусі працэс інстытуцыяналізацыі партый працягваецца, важна вывучыць яго асаблівасці і выклікі, з якімі сутыкаюцца партыі ў сучасных умовах.

Мэтай артыкула з’яўляецца вызначэнне сутнасці працэсу інстытуцыяналізацыі палітычных партый, а таксама аналіз этапаў і асаблівасцей гэтага працэсу ў Беларусі. Дзеля рэалізацыі пастаўленай мэты неабходна выканаць наступныя задачы: вызначыць сутнасць навуковых катэгорый, якія надалей будуць выкарыстаны ў артыкуле; вылучыць складнікі працэсу інстытуцыяналізацыі партый; разгледзіць асаблівасці канкрэтных субпрацэсаў у межах інстытуцыяналізацыі палітычных партый у свеце; вылучыць асноўныя этапы інстытуцыяналізацыі партый у Беларусі.

### *Катэгарыяльны апарат даследавання*

Катэгорыя «інстытуцыяналізацыі палітычных партый» мае два складнікі. У дачыненні да катэгорыі «палітычная партыя» аўтарам былі зроблены спробы па раскрыцці сутнасці гэтага феномену раней [1]: партыя ёсць арганізаваная група людзей, якая аб’яднана на прынцыпах добраахвотнасці ды валодае агульнымі палітычнымі поглядамі, адлюстраванымі ў праграме партыі, а таксама прадстаўляе інтарэсы пэўных сацыяльных супольнасцей і арыентаваная на дасягненне сваіх мэтаў шляхам атрымання палітычнай улады.

У дачыненні да катэгорыі «інстытуцыяналізацыя» у сучасных сацыяльных навуках няма выразнага і адзінага азначэння. Абумоўлена гэта тым, што катэгорыя «інстытуцыяналізацыя» вытворная ад катэгорыі «інстытут», у дачыненні да якой у айчыннай і замежнай навуковай літаратуры няма адзінства меркаванняў. Усе пазіцыі

даследчыкаў адносна вызначэння катэгорыі «інстытут» могуць быць ранжыраваныя на чатыры напрамкі, якія хоць і не ўступаюць у відавочную супярэчнасць, але так ці інакш маюць розныя падставы.

1. Нарматыўны напрамак (М. Вэбэр, Д. Норт, Т. Парсанс, Дж. Шумпетар і інш.), у межах якога інстытут вызначаецца ў якасці набору правілаў, нормаў і працэдур, якія падтрымліваюцца грамадствам ды яго членамі і якія рэгулююць паводзіны людзей у пэўных сітуацыях.

2. Арганізацыйны напрамак (Э. Гідэнс, Р. Даль, А. М. Салаўёў, У. Г. Чарнякін, паводле гэтага напрамку інстытут разумеецца як арганізацыя, структура, аб'яднанне людзей, якое выступае як калектыўны актар.

3. Інтэракцыйны напрамак (П. Бергер, Т. Лукман, Г. В. Пушкарова, С. Хантынгтан), у адпаведнасці з якім інстытут разумеюць як калектыўныя, узаемныя дзеянні (практыкі) людзей, якія паўтараюцца зноў і зноў.

4. Комплексны напрамак (А. В. Абрамаў, Г. С. Бондарава, М. С. Бондараў, М. М. Равачкін) – прадстаўнікі гэтага напрамку спрабуюць пераадолець пэўную аднабаковасць трох вышэй апісаных напрамкаў, даўшы ў пэўным сэнсе сінтэтычнае азначэнне катэгорыі «інстытут». Напрыклад, інстытут – сістэма сацыяльных установаў, якая склалася гістарычна, у якія ўключаны людзі для выканання безасабовых функцый дзеля грамадска значных патрэбаў, і якія забяспечваюць прагрэсіўнае развіццё грамадства праз рэгламентацыю паводзін людзей, а іх абнаўленне напрамую залежыць ад інтэлектуальных магчымасцяў і актуальных патрэбаў канкрэтнага соцыума [2, с. 98].

Уяўляецца, што менавіта чацвёрты напрамак найбольш прадуктыўны і дазваляе нівеліраваць пэўную абмежаванасць трох астатніх. На нашу думку, адной з найбольш удалых «комплексных» дэфініцый палітычнага інстытута з'яўляецца наступная: палітычны інстытут – гэта мадэль адносінаў, якая склалася гістарычна, нарматыўна замацавалася, арганізацыйна аформілася і рэгулярна ўзнаўляецца, а таксама звязана з заваяваннем палітычнай улады, ажыццяўленнем грамадскага кіравання і ўдзелам грамадзян у гэтых працэсах [3, с. 56]. Узяўшы за аснову менавіта такое разуменне палітычнага інстытута, вызначым, што «інстытуцыяналізацыя палітычных партый» – гэта працэс гістарычнага фарміравання і станаўлення, структурна-функцыянальнага развіцця, легітымацыі і легалізацыі ў межах палітычнай сістэмы партый як інстытута, які валодае ўласнымі сістэмнымі якасцямі.

Вызначэннем сутнасці і асаблівасцей інстытуцыяналізацыі палітычных партый займаліся многія вядомыя даследчыкі. Так, С. Хантынгтан падкрэслівае, што інстытуцыяналізацыя партый – гэта працэс, з дапамогай якога заканчваецца фарміраванне партый, якія набываюць каштоўнасць і стабільнасць [4, с. 394]. Іншы амерыканскі даследчык К. Джанда пад інстытуцыяналізацыя партый разумее ступень, з якой партыя матэрыялізуецца ў нешта канкрэтнае ў грамадскай свядомасці, у выніку чаго яна існуе незалежна ад уласных лідараў, рэгулярна ўцягваючыся ў значныя мадэлі паводзін [5, с. 95].

Дж. Лапаламбара вызначыў інстытуцыяналізацыю як «працэс, у выніку якога партыі становяцца ўстойлівымі, прадказальнымі і легітымнымі актарамі палітычнай сістэмы» [6, с. 15].

А. І. Дзюгурава адзначае, што інстытуцыяналізацыя партый прадстаўляе сабой працэсператварэння палітычных партый у паўнавартасны канстытуцыйна-прававы і палітычны інстытут [7, с. 13]. Па нашым меркаванні, з улікам разгледжаных вышэй пазіцый і прапанаванага ўласнага азначэння у межах інстытуцыяналізацыі партый можна вылучыць тры субпрацэсы: гістарычнае і структурна-функцыянальнае развіццё партый, іх легітымацыя ў межах палітычнай сістэмы, прававая інстытуцыяналізацыя партый.

**Гістарычнае і структурна-функцыянальнае развіццё партый**

Разгледзім асноўныя этапы ў межах першага з азначаных субпрацэсаў, якія характарызуюць якасныя трансфармацыі інстытута партый у гістарычным працэссе:

1) пратапартыйныя групы першабытных грамадстваў: нешматлікія, нерэгулярныя і няўстойлівыя як арганізацыйна, так і ідэйна групоўкі, якія пачынаюць узнікаць ужо ва ўмовах першабытнага грамадства вакол першых органаў кіравання ў межах родаплемяннога ладу;

2) пратапартыйныя саслоўныя групоўкі Антычнасці і Сярэднявечча: розныя слабаарганізаваныя групоўкі, якія не маюць выразнай ідэйнай арыентацыі і якія ў гэты працяглы перыяд часу складаліся, безумоўна, часцей за ўсё з прадстаўнікоў арыстакратыі, якая мела неабходныя рэсурсы і доступ да ўладных рычагоў (існавалі, аднак, і такія неарыстакратычныя пратапартыйныя групоўкі, як папуляры ў Рымскай рэспубліцы канца II – I ст. да н. э., і гвельфы ў Італіі ў XII–XVI стст.). Гэтыя групоўкі імкнуліся аказваць уплыў на палітычнае жыццё ў розных краінах у вызначаныя эпохі, адстойваючы як саслоўныя, так і часта абмежаваныя групавыя (кланавыя) інтарэсы ці прадстаўляючы нечыя персанальныя інтарэсы ў межах саслоўя арыстакратыі;

3) пратапартыйныя фракцыйныя групоўкі Новага часу: былі прадстаўлены палітычнымі клубамі і саюзамі альбо ж больш устойлівымі палітычнымі саюзамі або клубамі лакальнага характару (напрыклад, Брэтонскі клуб), якія валодалі ўжо пэўнай арганізацыяй у межах парламента, але ўсё яшчэ не мелі выразнай ідэйнай праграмы і па сваёй сутнасці з'яўляліся закрытымі элітарнымі групоўкамі, адарванымі ад шырокіх пластоў насельніцтва. Можна вылучыць наступныя фактары, якія аказалі ўплыў на ўзнікненне падобных груповак: узмацненне палітычнай канкурэнцыі паміж рознымі сацыяльнымі групамі (паміж феадальнай арыстакратыяй і буржуазіяй, каталікамі і пратэстантамі і інш.); абмежаванне абсалютысцкіх функцый дзяржавы; з'яўленне і развіццё парламентарызму; узнікненне аўтаномнай асобы і яе жаданне актыўна ўдзельнічаць у грамадска-палітычным жыцці і аказваць уплыў на ўладу;

4) сучасныя палітычныя партыі Найноўшага часу: маюць выразную і разгалінаваную арганізацыйную структуру, вызначаную статутам, які быў прыняты на з'ездзе, а таксама зацверджаную на з'ездзе канкрэтную ідэйна-палітычную праграму. Сучасныя партыі арыентаваны на прадстаўніцтва больш шырокіх группавых інтарэсаў, што робіць іх масавымі палітычнымі арганізацыямі. Вылучаюцца два ключавыя фактары ўзнікнення сучасных партый – пашырэнне выбарчага права і ўзнікненне арганізаванага працоўнага руху.

**Легітымацыя палітычных партый**

У сучасных умовах узровень легітымнасці партый можна вымяраць колькасна: рэйтынгі даверу партыям, вынікі ўдзелу партый у выбарах рознага ўзроўня і г. д. Да Найноўшага часу найбольш выразна ацаніць узровень даверу да пратапартыйных утварэнняў можна праз аналіз палітыка-філасофскіх дактрын і канцэпцый. Доўгі час ў палітычнай тэорыі існавала ўстойлівая традыцыя антыпартызму, г. зн. крытычнага, у лепшым выпадку стрыманага стаўлення да пратапартыйных утварэнняў, аж да адмаўлення іх неабходнасці і карыснасці ў грамадстве. Карані антыпартызму сягаюць у часы Антычнасці. Само слова «партыя», якім ужо ў Антычнасці абазначалі розныя палітычныя групоўкі, паходзіць ад лацінскага «pars», што азначае «частка», паказваючы, што партыя прадстаўляе не агульныя інтарэсы, а інтарэсы пэўнай групы ў грамадстве. Арыстоцель у «Палітыцы» дзяліў полісы на правільныя, дзе кіраўнікі імкнуцца да агульных дабротаў, і няправільныя, дзе яны адстойваюць свае прыватныя інтарэсы. Такім чынам, партыя, арыентаваная на прыватныя інтарэсы, упісваецца ў арыстоцелеўскую логіку няправільных палітычных структур і асацыюецца з палітычным злом.

У Сярэднявеччы, у эпоху манархій у Еўропе пераважалі кансерватыўныя ідэі аб важнасці адзінства дзяржаўных перакананняў і «гармоніі інтарэсаў» феадальнага грамадства, што выключала існаванне пратапартый у палітыцы і сацыяльнай структуры. У буржуазна-ліберальных дактрынах пратапартыі адхіляліся як носьбіты «прыватных інтарэсаў», якія пагражаюць «агульнай волі» народа. Кансерватыўная ідэалогія разглядала пратапартыі як пагрозу традыцыйным структурам і адзінству ўлады.

Аднак з часам узнікла больш памяркоўнае стаўленне да пратапартый, упершыню выказанае Н. Макіявелі і Ф. Бэканам, якія ўбачылі ў іх натуральны вынік палітычнай барацьбы, хоць і прызнавалі, што гэта пагражае дабрабыту і цэласнасці грамадства. Рэалізм у стаўленні да пратапартый праявіўся таксама ў творах «бацькоў-заснавальнікаў» ЗША. Пераход да прызнання партый звязаны з эвалюцыяй дэмакратычных інстытутаў і развіццём саміх партый, што ў XIX ст. прывяло да фарміравання

сучаснага тыпу палітычнай партыі і іх прававой інстытуцыяналізацыі.

**Прававая інстытуцыяналізацыя партый**

Станаўленне любога палітычнага інстытута, у тым ліку і палітычнай партыі, прадугледжвае іх прававое афармленне. Прававая ж інстытуцыяналізацыя партый – параўнальна новая з'ява ў сучасным праве. Пад прававой інстытуцыяналізацыяй палітычных партый варта разумець працэс легалізацыі партый у межах палітычнай сістэмы, звязаны з фарміраваннем партыйнага права (фарміравання дзяржавай нарматыўных узораў іх дзейнасці). Існуюць розныя аўтарскія пазіцыі наконт азначэння гэтай з'явы. Так, А. В. Курачкін вызначае, што «прававая інстытуцыяналізацыя палітычных партый уяўляе сабой працэс трансфармацыі грамадскіх форм асацыяцый грамадзян (не афармленых у адпаведнасці з патрабаваннямі дзеючага заканадаўства), аб'яднаных агульнай палітычнай мэтай, у палітыка-прававы інстытут шляхам уключэння іх у сферу комплексу адносін, што рэгулюецца правам і што звязаны са стварэннем, арганізацыяй і дзейнасцю палітычных партый» [8 с. 35]. Прычым у межах субпрацэсу прававой інстытуцыналізацыі навукоўцы вылучаюць уласныя складнікі: канстытуцыяналізацыю, г. зн. уключэнне ў Канстытуцыю асноўных прынцыпаў статусу палітычных партый, і заканадаўчую інстытуцыяналізацыю, у выніку якой прававое становішча партыі атрымлівае далейшае рэгуляванне ў спецыяльных законах і іншых нарматыўна-прававых актах, што канкрэтызуюць канстытуцыйныя палажэнні. Умоўна можна вылучыць некалькі этапаў прававога рэгулявання палітычных партый.

У канцы XIX – пачатку XX ст., нягледзячы на структурна-функцянальнае афармленне партый і іх легітымацыю, права практычна ігнаравала існаванне і дзейнасць палітычных партый.

У міжваенны перыяд у шэрагу краін упершыню замацоўваюцца канстытуцыйныя палажэнні аб дзейнасці палітычных партый (Канстытуцыі Чэхаславакіі, Аўстрыі, Уругвая), аднак гэтыя канстытуцыі абмяжоўваліся толькі кароткім згадваннем аб партыях. Больш шырокая прававая рэгламентацыя дзейнасці партый пачынаецца ў межах выбарчага і парламенцкага заканадаўства.

Пасля Другой сусветнай вайны аб'ектам прававога рэгулявання становіцца увесь комплекс адносін, звязаных са стварэннем і дзейнасцю партый. Галоўнай асаблівасцю гэтага этапу з'яўляецца шырокае канстытуцыйнае прызнанне палітычных партый (пасляваенныя Канстытуцыі Грэцыі, Іспаніі, Італіі, ФРГ і інш.), а таксама прыняцце ў шэрагу краін спецыяльных законаў аб палітычных партыях (ФРГ – 1967 г., Партугалія – 1974 г. і інш.). У выніку да 1960–1970-х гг. была створана досыць разгорнутая прававая база дзейнасці палітычных партый. Крушэнне таталітарных і аўтарытарных рэжымаў на мяжы 1980–1990-х гг. паслужыла важным штуршком для далейшага ўдасканалення інстытуцыяналізацыі партый.

Сёння прававая інстытуцыяналізацыя партый набывае ўніверсальны характар, пашыраючы межы рэгулявання дзейнасці партый. Асноўныя формы прававой інстытуцыяналізацыі палітычных партый уключаюць:

1) канстытуцыйнае замацаванне прававога статусу партый, асноватворных прынцыпаў арганізацыі і функцыянавання партый;

2) спецыяльныя нарматыўныя акты (законы, дэкрэты, пастановы) аб палітычных партыях, якія развіваюць канстытуцыйныя палажэнні, рэгламентуючы парадак стварэння і рэгістрацыі партый, вызначаючы іх асноўныя задачы і функцыі, пытанні фінансавай дзейнасці і інш;

3) іншыя нарматыўна-прававыя акты, якія рэгламентуюць асобныя бакі дзейнасці палітычных партый (законы аб выбарах, аб сродках масавай інфармацыі, падатковы кодэкс, рэгламенты палат парламента);

4) судовыя рашэнні і прэцэдэнты (гэтая форма атрымала досыць шырокае распаўсюданне ў палітыка-прававой практыцы ЗША, Канады, Англіі і іншых краінах).

У агульным плане можна вылучыць ключавыя напрамкі прававой інстытуцыяналізацыі палітычных партый:

1) замацаванне права грамадзян на аб'яднанне, свабоды стварэння і дзейнасці палітычных партый;

2) рэгламентацыя парадку ўтварэння, прыпынення і спынення дзейнасці партый;

3) вызначэнне месца і ролі партый у палітычнай сістэме, іх задач, функцый, правоў і абавязкаў;

4) рэгламентацыя ўзаемаадносін палітычных партый з іншымі палітычнымі інстытутамі;

5) рэгуляванне фінансавай дзейнасці палітычных партый.

Працэс інстытуцыяналізацыі партый на беларускіх землях рухаўся адпаведна апісанным раней этапам гістарычнага і структурна-функцыянальнага развіцця партый, а таксама іх легітымацыі, хаця і з відавочным адставаннем ад краін Захаду. Партыі як інстытут фарміраваліся на працягу стагоддзяў у выглядзе розных пратапартыйных груповак (ад шляхецкіх і магнацкіх груповак Радзівілаў, Сапегаў і г. д. да фракцыйных груповак у Соймах Рэчы Паспалітай – патрыятычнай і гетманцкай партый). Сучасныя палітычныя партыі на тэрыторыі Беларусі пачынаюць узнікаць у канцы XIX – пачатку XX ст. (Беларуская сацыялістычная Грамада, Краёвая партыя Літвы і Беларусі, Канстытуцыйна-каталіцкай партыяй Літвы і Беларусі і інш.). Паводле апошніх гістарычных даследаванняў, у Расііскай Імперыі на мяжы XIX–XX ст. з’явілася каля 300 палітычных партый, арганізацый і рухаў, з якіх каля 60 прэтэндавалі на ролю агульнарасійскіх, а астатнія мелі рэгіянальны ці нацыянальны характар. Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. і прынятыя пасля яго ўказы аб выбарах, скліканні Дзяржаўнай Думы, аб таварыствах і саюзах адзначылі пачатак працэсу прававой інстытуцыяналізацыі ў Расійскай імперыі. Аднак перамога бальшавікоў прывяла да паступовага адыходу з гістарычнай сцэны астатніх палітычных партый, прыпыніўшы у тым ліку працэс інстытуцыяналізацыі партый.

За час існавання СССР не склаўся вопыт належнага прававога рэгулявання палітычных партый. Агульныя патрабаванні да партый не выходзілі за межы патрабаванняў да грамадскіх аб’яднанняў, а савецкае заканадаўства аб грамадскіх арганізацыях не было глыбокім. Толькі «Палажэнне аб добраахвотных таварыствах і саюзах» ад 1932 г. рэгулявала стварэнне грамадскіх аб’яднанняў. Нормы, якія тычыліся партый, з’яляюцца ў Канстытуцыях СССР пачынаючы з 1936 г. Артыкул 126 Канстытуцыі 1936 г. абвяшчаў свабоду аб’яднанняў, але усталёўваў, што «найбольш свядомыя і актыўныя грамадзяне аб’ядноўваюцца ў Камуністычную партыю». Канстытуцыя 1977 г. вызначыла КПСС ядром палітычнай сістэмы. Аднапартыйнасць не была прама замацавана, аднак фактычна існавала манаполія адной партыі. Усё вышэй згаданае у спалучэнні з бюракратызаванасцю КПСС і стратай ёю легітымнасці не спрыяла інстытуцыяналізацыі партый.

**Інстытуцыяналізацыя партый у суверэннай Беларусі**

У працэсе інстытуцыяналізацыі палітычных партый у суверэннай Беларусі можна вылучыць некалькі этапаў.

1. Перыяд зараджэння палітычных партый у межах савецкай палітычнай сістэмы (1985–1990 гг.). Гэты пераходны перыяд звязаны з абвяшчэннем галоснасці ў савецкім грамадстве, стратай легітымнамсці і пануючай ролі КПСС і КПБ, а таксама фарміраваннем першых некамуністычных грамадскіх рухаў (Талака, Тутэйшыя, Мартыралог Беларусі і інш.) і іх пераўтварэннем у палітычныя партыі. У лютым 1990 г. пазачарговы з’езд народных дэпутатаў СССР адмяніў арт. 6 Канстытуцыі СССР, што фактычна азначала легалізацыю прынцыпу палітычнага плюралізму і адкрыла шлях да шматпартыйнасці. 9 кастрычніка 1990 г. быў прыняты Закон СССР «Аб грамадскіх аб’яднаннях», які гарантаваў грамадзянам свабоду стварэння грамадскіх аб’яднанняў і спрасціў працэдуру іх рэгістрацыі. 4 сакавіка 1990 г. адбыліся першыя свабодныя выбары ў БССР, падчас якіх з’явілася апазіцыя КПБ у выглядзе БНФ у Вярхоўным Савеце. У гэты перыяд былі прыняты Пастанова Вярхоўнага Савета БССР ад 28.07.1990 № 222-XII «Аб рэгістрацыі грамадскіх аб’яднанняў у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы», Пастанова Савета Міністраў БССР ад 03.10.1990 № 255 «Аб зацвярджэнні Часовага палажэння аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў грамадзян у Беларускай ССР», у якіх было замацавана, што заснавальнікамі палітычных партый могуць быць не менш за сто грамадзян краіны, пры гэтым была ўсталявана неабходнасць выплаты дзяржаўнай пошліны ў памеры 10 мінімальных акладаў, што было значнай перашкодай для рэгістрацыі. У гэты перыяд

былі закладзены ўмовы фарміравання партыйнай сістэмы суверэннай Беларусі.

2. Пачатак інстытуцыяналізацыі палітычных партый у суверэннай Беларусі (1991 г. – да парламенцкіх выбараў 1995 г.). Пачынаецца працэс актыўнага партыйнага будаўніцтва і легітымацыі партый у межах палітчнай сістэмы (рэйтынгі папулярнасці канкрэтных беларускі партый у гэты перыяд дасягаюць самых высокіх пазнак (КПБ на 03.1991 г. – 52,1 %; ПКБ на 11.1995 г. – 34,9 %; БНФ на 11.1991 г. – 18,6 %), разгортваюцца працэсы канстытуцыяналізацыі і заканадаўчай інстытуцыяналізацыі партый у Беларусі. З'яўляюцца важнейшыя палажэнні, якія тычацца дзейнасці палітычыных партый у прынятай у 1994 г. Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (артыкулы 4, 5, 36 і 102). У гэты перыяд прымаецца першы спецыяльны нарматыўны прававы акт, які ўрэгуляваў асновы дзейнасці палітычных партый у Беларусі – Закон Рэспублікі Беларусь «Аб палітчыных партыях», у якім лік заснавальнікаў партыі быў павялічаны са 100 да 500 чалавек, адбылося павелічэнне дзяржпошліны за рэгістрацыю да 50 заработных плат. У канцы 1994 – пачатку 1995 г. была праведзена перарэгістрацыя партый. У прынятых на гэтым этапе нарматыўных актах былі закладзены асноўныя напрамкі прававой інстытуцыяналізацыі партый: рэгламентацыя парадку ўтварэння, прыпынення і спынення дзейнасці партый; вызначэнне месца і ролі партый у палітычнай сістэме, іх правоў і абавязкаў; рэгламентацыя ўзаемаадносін палітычных партый з іншымі палітычнымі інстытутамі; рэгуляванне фінансавай дзейнасці палітычных партый і інш. На гэтым этапе з'яўляецца большасць дзеючых да 2023 г. беларускіх партый.

3. Трансфармацыя палітычнай сістэмы Беларусі і прыпыненне працэсу інстытуцыяналізацыі партый (1995–1999 гг.). Палітычны крызіс, якія зараджаецца і дасягае апагею ў гэты перыяд у Беларусі, не мог не аказаць уплыву на працэсы інстытуцыяналізацыі партый. У 1996 г. у Рэспубліцы Беларусь быў праведзены лёсавызначальны рэферэндум, па выніках якога Вярхоўны Савет прыпыніў сваё існаванне і быў утвораны новы двухпалатны Парламент са значна меншымі паўнамоцтвамі. Вялікі ўплыў на працэс інстытуцыяналізацыі партый аказаў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1999 г. «Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў і грамадскіх аб'яднанняў». У адпаведнасці з ім была павялічана мінімальная колькасць членаў партыі, патрэбная для яе рэгістрацыі, з 500 да 1 000 чалавек. У 1999 г. была праведзена чарговая перарэгістрацыя партый, па выніках якой лік дзеючых партый значна скараціўся. Гэты перыяд характарызуецца аб'яднаннямі і шматлікімі расколамі ў шэрагах саміх партый (стварэнне АГП, раскол ПКБ, раскол БНФ).

4. Дэлегетымацыя і паступовы занепад партый (2000–2022 гг.). Практычна ўвесь гэты перыяд партыі ў Беларусі знаходзяцца ў нефункцыянальным стане, што было звязана як з пэўнымі асаблівасцямі палітычнай сістэмы Беларусі на гэтым этапе, так і з канкрэтнымі недахопамі ў дзейнасці саміх партый. Напрыклад, неэфектыўнымі формамі працы з насельніцтвам, неактуальнасцю і слабай распрацаванасцю партыйных праграм, слабай матэрыяльна-тэхнічнай базай і нізкай прадстаўленасцю ў СМІ і сацыльных медыя, крызісамі лідарства і іміджавымі стратамі, невысокім кваліцыйным патэнцыялам партый і інш. Пры гэтым працэсы прававой інстытуцыяналізацыі працягваліся. Прымаліся і ўдасканальваліся нарматыўна-прававыя акты, якія рэгламентавалі асобныя бакі дзейнасці палітычных партый. Напрыклад, Выбарчы кодэкс (паводле якога партыі валодаюць пэўнымі выбарчымі прывілеямі: вылучэнне кандыдатаў, удзел у фарміраванні выбарчых камісій і г. д.), Закон «Аб сродках масавай інфармацыі» і інш. Рэйтынгі партый паступова пачынаюць падаць (напрыклад, самай рэйтынгавай партыяй у 2008 г. з паказчыкам у 2 % была ЛДПБ, пры гэтым супраць усіх прагаласавалі 22,7 % рэспандэнтаў, а не змаглі даць адказ 63,8 %; у 2010 г. самай рэйтынгавай была БСДГ – 1,6 %; супраць усіх прагаласавалі 21,5 %; не змаглі даць адказ 65,5 %).

5. Трансфармацыя палітычнай сістэмы і магчымы новы этап інстытуцыяналізацыі партый (2023 г. – цяперашні час). У межах новай стратэгіі развіцця беларускай палітычнай сістэмы пасля рэферэндуму 2022 г. быў намечаны новы вектар – далейшае паступальнае развіццё грамадзянскай

супольнасці і рэфармаванне партыйнай сістэмы краіны на аснове традыцыйных асноватворных каштоўнасцей беларускага народа. Прававой асновай рэалізацыі гэтага вектара стала падпісанне Кіраўніком беларускай дзяржавы 14 лютага 2023 г. законаў «Аб асновах грамадзянскай супольнасці» і «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў». Паводле апошняга лік заснавальнікаў, неабходны для стварэння і дзейнасці палітычнай партыі, быў павялічаны з 1 000 да 5 000. Пры гэтым ад кожнай з абласцей і г. Мінска неабходна не менш як 100. Упершыню былі сфармуляваны асноўныя мэты і задачы палітычных партый: забеспячэнне непахіснасці канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды; удзел у кіраванні дзяржавай праз сваіх прадстаўнікоў; садзейнічанне рэалізацыі і абароне правоў, свабод і інтарэсаў грамадзян; фарміраванне сталай палітычнай самасвядомасці грамадзян; фарміраванне грамадскай думкі; забеспячэнне сацыяльнай справядлівасці; палітычная адукацыя і выхаванне грамадзян, таксама іншыя мэты і задачы, якія не супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і актам заканадаўства [9].

Заканадаўчыя змены прывялі да скарачэння ліку зарэгістраваных партый. Сёння ў Беларусі дзейнічаюць чатыры партыі. Пры гэтым паводле сацыялагічнага апытання, праведзенага ў сакавіку 2023 г., давяраюць беларускім палітычным партыям 27,3 % насельніцтва, не давяраюць 31 %, не змаглі даць адказ 41,7 % [10, с. 138]. Упершыню з 1995 г. партыі даволі значна прадстаўлены ў Парламенце: партыя «Белая Русь» (па выніках мінулых выбараў у Палату Прадстаўнікоў – 51 дэпутат, ці 46,4 % месцаў); Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (8 дэпутатаў, ці 7,3 % месцаў); Камуністычная партыя Беларусі (7 дэпутатаў, ці 6,4 % месцаў); Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі (4 дэпутаты, ці 3,6 % месцаў).

**Заключэнне**

На сённяшні дзень можна з упэўненасцю сцвярджаць, што працэс інстытуцыяналізацыі партый у Беларусі не скончаны. Гэтаму спрыяў вялізны шэраг фактараў, якія запавольвалі ці цалкам прыпынялі гэты працэс ад моманту ўзнікнення першых сучасных партый да сённяшняга дня: асаблівасці палітычных сістэм, у склад якіх ўваходзілі беларускія землі (абсалютызм у Расійскай імперыі, а затым таталітарная аднапартыйная сістэма СССР); рэвалюцыйныя і ваенныя ўзрушэнні першай паловы XX ст.; слабае развіццё інстытуту парламентарызма і грамадзянскай супольнасці; фарміраванне неактывісцкага тыпу палітычнай культуры і інш. Пасля распаду СССР інстытуцыяналізацыя партый распачалася практычна з пачатку.

Разгледжаныя этапы інстытуцыяналізацыі партый у суверэннай Беларусі сведчаць аб тым, што гэты працэс зноў запаволіўся з сярэдзіны 1990-х г. Сёння відавочнымі з’яўляюцца непаслядоўнасць гэтага працэсу ў параўнанні з агульнасусветнымі тэндэнцыямі, што звязана з асаблівасцямі палітычнай сістэмы нашай краіны і ўкараненнем карпаратыўнай мадэлі прадстаўніцтва інтарэсаў.

Палітычныя партыі як інстытут не атрымалі паслядоўнага гістарычнага і структурна-функцыянальнага развіцця, працэс легітымацыі не завершаны. Пры гэтым прававая інстытуцыяналізацыя ідзе вельмі актыўнымі тэмпамі і рэалізуецца ў розных формах і напрамках, якія адпавядаюць агульнасусветным тэндэнцыям фарміравання партыйнага права. Аднак распачатая ў 2023 г. трансфармацыя палітычнай сістэмы можа стаць неабходным імпульсам да інтэнсіфікацыі партыйнага жыцця і ўзмацнення ролі партый у палітычнай сістэме.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Решетников, С. В. Понятие политической партии и партийной системы: теоретические аспекты / С. В. Решетников, М. С. Мамекин // Труд. Профсоюзы. Общество (МИТСО). – 2022. – № 1 (75). – С. 98–107.

2. Равочкин, Н. Н. Концептуализация понятия «институт» в современном социально-философском дискурсе / Н. Н. Равочкин, Н. С. Бондарев, Г. С. Бондарева // Социодинамика. – 2020. – № 4. – С. 85–98.

3. Абрамов, А. В. Политический институт и политическая институционализация: определение понятий / А. В. Абрамов // Власть. – 2010. – № 5. – С. 53–55.

4. Huntington, S. P. Political Development and Political Decay / S. P. Huntington // World Politics. – 1965. – Vol. 17, nr 3. – P. 386–430.

5. Джанда, К. Сравнение политических партий: исследование и теория / К. Джанда // Соврем. сравнит. политология. – М. : МОНФ, 1997. – С. 84–144.

6. La Palombara, J. Political Parties and Political Development / J. La Palombara, M. Weiner // Political Science. – Princeton University Press, 1966. – 487 p.

7. Дюгурова, А. И. Институционализация партийной системы в Российской Федерации : автореф. дис. ... канд. полит. наук : 23.00.02 / А. И. Дюгурова. – Казань, 2011. – 23 с.

8. Курочкин, А. В. Особенности правовой институционализации политических партий / А. В. Курочкин // Учен. зап. Казан. гос. ун-та. Гуманитар. науки. – 2008. – Т. 150, кн. 5. – С. 35–44.

9. Об изменении законов по вопросам деятельности политических партий и других общественных объединений [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 14 февр. 2023 г., № 251-З// Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https:// https://pravo.by/document/?guid=3961&p0=H12300251. – Дата доступа: 20.08.2024.

10. Шендик, Т. А. Партийное строительство в Беларуси: сущность, предпосылки, технологии / Т. А. Шендик. – Минск : РИВШ, 2023. – 208 с.

## REFERENCES

1. Rieshetnikov, S. V. Poniatije politichieskoj partii i partijnoj sistiemy: tieorietichieskije aspiekty / S. V. Rieshetnikov, M. S. Mamiekin // Trud. Profsojuzy. Obshchiestvo (MITSO). – 2022. – № 1 (75). – S. 98–107.

2. Ravochkin, N. N. Konceptualizacija poniatija «institute» v sovriemiennom social’no-filosofskom diskursie / N. N. Ravochkin, N. S. Bondariev, G. S. Bondarieva // Sociodinamika. – 2020. – № 4. – S. 85–98.

3. Abramov, A. V. Politichieskij institut i politichieskaja institucionalizacija: opriedielienije poniatij / A. V. Abramov // Vlast’. – 2010. – № 5. – S. 53–55.

4. Huntington, S. P. Political Development and Political Decay / S. P. Huntington // World Politics. – 1965. – Vol. 17, nr 3. – P. 386–430.

5. Dzhanda, K. Sravnienije politichieskikh partij: issliedovanije i tieorija / K. Dzhanda // Sovriemiennaja sravnitiel’naja politologija. – M. : MONF, 1997. – C. 84–144.

6. La Palombara, J. Political Parties and Political Development / J. La Palombara, M. Weiner // Political Science. – Princeton University Press, 1966. – 487 p.

7. Diugurova, A. I. Institucionalizacija partijnoj sistiemy v Rossijskoj Fiedieracii : avtorief. dis. … kand. polit. nauk : 23.00.02 / A. I. Diugurova. – Kazan’, 2011. – 23 s.

8. Kurochkin, A. V. Osobiennosti pravovoj institucionalizacii politichieskikh partij / A. V. Kurochkin // Uchion. zap. Kazan. gos. un-ta. Gumanitar. nauki. – 2008. – T. 150, kn. 5. – S. 35–44.

9. Ob izmienienii zakonov po voprosam diejatiel’nosti politicheskikh partij i drugikh obshchiestviennykh objedinienij [Eliektronnyj riesurs] : Zakon Riesp. Bielarus’, 14 fievr. 2023 g., № 251-Z // Nacional’nyj pravovoj Internet-portal Riespubliki Bielarus’. – Riezhim dostupa: https://pravo.by/-document/?guid=3961&p0=H12300251. – Data dostupa: 23.02.2024.

10. Shendik, T. A. Partijnoje stroitiel’stvo v Bielarusi: sushchnost’, priedposylki, tiekhnologii / T. A. Shendik. – Minsk : RIVSH, 2023. – 208 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 04.12.2024*